


# Па-за кадрам: ад гісторыі сям'і да гісторыі супольнасці

ГІСТАРЫЧНЫ КОНКУРС ДЛЯ МОЛАДЗІ

1945 1946 1947

## ЗМЕСТ


Мэты конкурсу______________________ 2
Умовы ўдзелу______________________ 3
Сутнасць конкурсу______________________ 4
Як павінна выглядаць конкурсная работа?________ 6
Прыкладны пералік тэм для даследавання______ 7
Алгарытм працы з фотаздымкам______________ 8
Парады ўдзельніку______________________ 10
З чаго пачаць размову?__________________ 11
Тыпы інтэрв'ю______________________ 12
Апрацоўка інфармацыі__________________ 12
Як і хто будзе ацэньваць работу?______________ 13
Дадатак № 1______________________ 14
Дадатак № 2______________________ 15

Конкурс праводзіцца Прадстаўніцтвам зарэгістраванага аб'яднання «Deutscher Volkshochshul-Verband e.V» (ФРГ) у Рэспубліцы Беларусь (Прадстаўніцтва DVV) у супрацоўніцтве з МГА «Гісторыка» ў рамках праекта «Конкурсы па гісторыі ў Беларусі, Грузіі, Малдове, Украіне» пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Германіі.

Праект скіраваны на аказанне садзейнічання ў развіцці гістарычных конкурсаў у Беларусі, Грузіі, Малдове і Украіне, а таксама на стымуляванне міжнароднага супрацоўніцтва па дадзеным пытанні. Праект рэалізуецца DVV International і Фондам ім. Кёрбера ў партнёрстве з міжнароднай сеткай EUSTORY і мясцовымі арганізацыямі ў краінах-удзельніцах. У Беларусі гэта Маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Гісторыка».

## МЭТЫ КОНКУРСУ

- Стымуляванне вывучэння гісторыі праз даследчую і праектную дзейнасць.
- Стымуляванне развіцця мясцовага краязнаўства, вывучэння сямейнай гісторыі і іх сувязі з працэсамі і з'явамі, якія адбываюцца ў мясцовай супольнасці і краіне.
- Атрыманне ўдзельнікамі навыкаў працы па метадзе «вуснай гісторыі», умення працаваць з фотадакументамі і аналізаваць іх.
- Папулярызацыя конкурсаў па гісторыі.



## УМОВЫ ЎДЗЕЛУ

*Тэрмін правядзення конкурсу –*
***з 20 снежня 2017 па 5 мая 2018 года***

*Апошні тэрмін падачы работ –* ***5 мая 2018 года***

*(фіксуецца па даце дасылкі электроннага ліста).*

*Да ўдзелу запрашаецца моладзь ад 15 да 25 гадоў.*

*На момант абвяшчэння вынікаў конкурсу (чэрвень 2018) удзельніку павінна споўніцца 15 гадоў. На момант завяршэння конкурсу ўдзельніку не павінна быць больш за 25 гадоў.*

Удзел у конкурсе могуць прымаць: старшакласнікі, навучэнцы, студэнты розных навучальных устаноў, маладыя спецыялісты, маладыя актывісты НДА, маладзёжных клубаў, навучальных гурткоў, секцый і г.д.

На конкурс прымаюцца як індывідуальныя работы, так і групавыя (група не больш за 4 чалавекі).

Наяўнасць ва ўдзельнікаў конкурсу куратара (кіраўніка даследчай работы) вітаецца. Кожны ўдзельнік можа мець аднаго або некалькіх куратараў.

Адзін куратар можа быць кіраўніком работ некалькіх удзельнікаў.

Удзельнікі без куратараў таксама дапускаюцца да конкурсу.

Пераможцы атрымаюць каштоўныя прызы і дыпломы. Лепшыя працы будуць прадстаўлены на цырымоніі ўзнагароджання, а аўтары найлепшых даследчых работ атрымаюць запрашэнне ў Германію на міжнародны маладзёжны летнік.

Усе астатнія ўдзельнікі і іх куратары атрымаюць спецыяльныя дыпломы ўдзелу.

**Вынікі конкурсу будуць абвешчаны**
**пасля 20 чэрвеня 2018 года**
**на парталах: www.historica.by**
**http://www.dvv-international.org.ua/uz/belarus/**

## СУТНАСЦЬ КОНКУРСУ

Савецкі перыяд пакінуў значны след у беларускай гісторыі. Аднак за вядомымі падзеямі незаўважаным застаецца лёс простага чалавека, які вучыўся, ствараў сям'ю, выхоўваў дзяцей, арганізоўваў свой побыт, працаваў, камунікаваў з мясцовай супольнасцю.

Але што мы пра гэта ведаем? ***Гісторыя побыту ў Беларусі другой паловы ХХ стагоддзя з'яўляецца маладаследаванай.*** Аднак мы можам даведацца пра яе ад непасрэдных сведак часу.

Важнай крыніцай інфармацыі з'яўляюцца ***тагачасныя фотаздымкі і ўспаміны людзей***, якія жылі за савецкім часам. Яны маглі быць непасрэднымі ўдзельнікамі пэўных лакальных падзей, сведкамі пераўтварэнняў у грамадскасці – індустрыялізацыі, урбанізацыі, атэізму... На жаль, гісторыкі зрэдку звяртаюцца да іх.





Тым не менш сведкі – сучаснікі тых падзей – маюць поўнае права перадаць нам уласнае бачанне гісторыі. Іх ***успаміны дазваляюць паглядзець на гістарычныя падзеі вачыма канкрэтнага чалавека*** ў кантэксце свайго жыцця, побыту і ўлічыць яго стаўленне да тых ці іншых пераменаў у грамадстве, супольнасці.

Разам з вуснымі ўспамінамі ***фотаздымкі з'яўляюцца свайго кшталту «ключом памяці»***. Аналіз фотадакументаў уключае ў сябе вывучэнне носьбітаў выявы з мэтай устанаўлення месца, часу, аўтарства здымка, даследаванне зместу і мастацкіх вартасцяў фотавыявы. Асноўная мэта пры гэтым – атрымаць адказ на пытанне пра тое, якія праблемы, інфармацыю дазваляе раскрыць фотакрыніца. Кожны з фотаздымкаў мае рысы, характэрныя для свайго часу.

Умовай конкурсу з'яўляецца выкарыстанне фотаздымкаў, зробленых у другой палове ХХ стагоддзя.

Удзельнікі конкурсу могуць запытацца ў сваякоў пра наяўнасць **цікавых фотаздымкаў ці дакументаў. Іх абавязкова трэба скапіраваць, а таксама занатаваць неабходную інфармацыю: што за дакумент, якога часу, каму належыць, што і хто сфатаграфаваны, калі зроблены** і г.д.



## ЯК ПАВІННА ВЫГЛЯДАЦЬ КОНКУРСНАЯ РАБОТА?

Храналагічныя рамкі конкурсу абмежаваны перыядам гісторыі Беларусі другой паловы XX стагоддзя (1945-1991 гг.). Каб прыняць удзел у конкурсе, неабходна на аснове работы з фотаздымкам ці серыяй фотаздымкаў з сямейнага (публічнага) архіва і інтэрв'ю (гутаркі са сведкам падзей і з'яў, адлюстраваных на фота) падрыхтаваць даследчую работу.

Конкурсная работа павінна ў абавязковым парадку ўключаць у сябе наступныя электронныя дакументы:

**1. Заяўку ўдзельніка.** Форму заяўкі гл. у Дадатаку 1.

**2. Даследчую работу.** Яна можа быць прадстаўле на ў *выглядзе эсэ* (тэкставай файл) або *мультымедыйнай прэзентацыі* (прэзентацыя, калаж і г.д.)

Даследчая работа - аўтарскі тэкст / прэзентацыя, напісаная / створаная ў вольнай форме, якая адлюстроўвае асноўныя думкі, ідэі і высновы ўдзельніка конкурсу. У ёй павінны быць спасылкі на гістарычныя даследаванні, дакументы, а таксама сабраныя ці выкарыстаныя падчас даследвання інтэрв'ю. У спасылках пазначаецца аўтар, назва работы, выходныя даныя, старонкі.

**Патрабаванні:**
- для эсэ (тэкставай работы): памер работы ад 3 да 6 старонак (ад 5 000 да 10 000 знакаў без прабелаў); шрыфт Times New Roman, памер 13 пт, міжрадковы інтэрвал 1,5.
- для прэзентацыі: агульная колькасць слайдаў 15-25.

**3. Дадаткі:**
- электронная(ыя) копія(і) фотаздымка(ў), на аснове якога(іх) была зробленая работа. Агульная колькасць фотаздымкаў — не больш за 5.
- інтэрв'ю з рэспандэнтам(амі). Могуць дасылацца ў выглядзе тэкставых, аўдыё-, відэафайлаў. Могуць быць інтэграваныя ў прэзентацыю.
- запоўненая анкета рэспандэнта (узор гл. Дадатак 2).



- Рабочыя мовы - беларуская або руская.
- Конкурсная праца дасылаецца на электронны адрас: pazakadram@gmail.com з абавязковай пазнакай *"На конкурс"*.

**Удзел у конкурсе бясплатны.**

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ТЭМ ДЛЯ ДАСЛЕДАВАННЯ

• Побыт і штодзённае жыццё. Арганізацыя дамашняга інтэр'еру. Фарміраванне хатніх бібліятэк.

• Сямейныя і мясцовыя традыцыі, урачыстасці. Асаблівасці падрыхтоўкі і святкавання (святочны стол, традыцыі супольнага святкавання).

• Традыцыя талакі. Узаемадапамога. Стаўленне да калектывізму.

• Адукацыя. Адукацыя і кар'ера. Адукацыйныя магчымасці за межамі навучальных устаноў. Мовы навучання.

• Арганізацыя і баўленне вольнага часу. Мерапрыемствы ў сельскіх клубах, дамах культуры, бібліятэках, тэатрах, на стадыёнах.

• Рэлігійнае жыццё. Вераванні і рэлігійныя погляды, іконы, духоўная літаратура, храмы.

• Планавая эканоміка і яе ўплыў на паўсядзённае жыццё (прадукты харчавання, медыцына, даступнасць тавараў, тэхнікі, жылля).

• Маладзёжныя субкультуры. Альтэрнатыўныя рухі. Мода.

• Праца. Рамёствы. Прафесійныя дынастыі.

Удзельнікі могуць не абмяжоўвацца прыкладным пералікам тэм і прапаноўваць сваю!

## АЛГАРЫТМ ПРАЦЫ З ФОТАЗДЫМКАМ

• Апішыце, што вы бачыце на фота. Калі ласка, надайце дастаткова часу такому апісанню – нават дробная дэталь можа мець вялікае значэнне.

• Якія аб'екты адлюстраваны на фота? Якія з іх, на вашу думку, аўтар хацеў вылучыць? Чаму? Што робяць людзі, прадстаўленыя на фота?

• Звярніце асаблівую ўвагу, калі людзі, адлюстраваныя на фота, спецыяльна прымаюць пэўную позу. Падумайце, чаму менавіта ў гэтым месцы і менавіта ў гэты час з'явіўся чалавек з фотаапаратам?

Фатаграфія – адзін з самых простых візуальных сродкаў для вывучэння гісторыі (па даступнасці і нагляднасці), але адначасова і адзін з самых складаных. Акрамя таго, што выяўлена на фота, трэба ўмець бачыць, як гэта выяўлена, чаму менавіта так і што не адлюстравана. Для працы з фотавыявай неабходны навык бачання.



Заўсёды прымайце да ўвагі, як фатаграфія звязаная з іншымі крыніцамі інфармацыі (тэкстамі, статыстычнымі звесткамі, мультыплікацыяй і г.д.), і паспрабуйце сфармуляваць агульную ідэю. Гэта дазволіць узбагаціць ваша невялікае даследаванне і павялічыць шансы на перамогу ў конкурсе.

• Якую максімальную інфармацыю можна атрымаць, разглядаючы фотаздымак? На якія пытанні фота не можа адказаць? Якая інфармацыя адсутнічае?

• Калі розныя крыніцы адна адной супярэчаць, паспрабуйце разабрацца, чаму так адбываецца. Якую новую інфармацыю можна атрымаць з супярэчнасці крыніц?

• Ці ўтрымліваецца ў фотаздымку тэкставая інфармацыя: плакаты, рэклама, подпісы? Калі дата здымка невядомая, паспрабуйце ўсімі магчымымі спосабамі высветліць прыблізны час яго з'яўлення.

## ПАРАДЫ ЎДЗЕЛЬНІКУ

Калі тэма абрана, варта абдумаць, што менавіта вы хочаце высветліць пра яе. Выразнае пытанне ў даследаванні дапаможа абмежаваць тэму, а таксама мэтанакіравана шукаць матэрыял і крыніцы для сваёй тэмы.

Як сфармуляваць сваё пытанне для даследавання?

Патрэбна запісаць, што жадаеце даведацца па сваёй тэме. Затым, зыходзячы з гэтага, паспрабуйце задаць дакладныя пытанні.

Пры гэтым выкарыстоўвайце, напрыклад, такія пытальныя словы: "Як ...? Чаму ...? Што ...? Для чаго ...?" Заўсёды правярайце сябе падчас даследавання. Ці адпавядае тое, над чым вы цяпер працуеце, пастаўленым пытанням?

Перш чым пачняце пошукі, праверце сваю тэму:

1. Ці не завялікая яна? Ці ахоплівае нейкі пэўны час? Ці можна па абраным фотаздымку грунтоўна апісаць пэўных асоб?

2. Ці ёсць якая-небудзь сувязь паміж тэмай і месцам вашага жыхарства, вучобы?

3. Ці знайшлі вы літаратуру па тэме (напрыклад, кнігі, артыкулы)?

4. Ці вызначыліся вы з крыніцамі (гэта могуць быць дакументы, газеты, фатаграфіі)? Ці ёсць у вас доступ да іх?

5. Ці ёсць у вас магчымасць апытаць відавочцаў падзей, адлюстраваных на фота, экспертаў? Відавочца – гэта чалавек, які можа расказаць пра падзеі, якія ён перажыў у мінулым. Эксперт валодае вялікай колькасцю інфармацыі па тэме.



## З ЧАГО ПАЧАЦЬ РАЗМОВУ?

1. Загадзя варта зрабіць план тэмы і скласці асноўныя пытанні. Перад тым як пачаць размову з рэспандэнтам (відавочцам фотаздымка, які аналізуецца), неабходна пазнаёміць яго з праектам, яшчэ раз патлумачыць фармат, мэту і тэму інтэрв'ю, праверыць гатоўнасць тэхнікі, прадугледзець адсутнасць пабочных гукаў, якія б маглі перашкаджаць запісу.

2. Пачынаць размову неабходна з высвятлення ў рэспандэнта асноўнай фактычнай інфармацыі: прозвішча, імя, імя па бацьку, месца пражывання, узрост і г.д.

3. Потым ідуць агульныя пытанні. Напрыклад: "Раскажыце пра Ваша дзяцінства…", "Якім Вам запомнілася жыццё ў СССР?" і г.д. Мэта гэтых пытанняў – даць магчымасць чалавеку расказаць тое, што ён лічыць самым значным у сваім жыцці. Далей можна арыентавацца на тэмы з падрыхтаванага апытальніка (арыентаваныя на высвятленне інфармацыі, змешчанай на фотаздымках), а таксама задаваць пытанні, якія вынікаюць з папярэдняга аповяду.

4. Не спяшайцеся задаваць пытанні! Задавайце іх па адным, ствараймце магчымасць для суразмоўцы падумаць, узважыць свае думкі. Не трэба перапыняць сведку! Лепш натаваць дадатковыя пытанні і задаваць іх у канцы інтэрв'ю.

5. Размова з рэспандэнтам можа пайсці не ў тым накірунку, які вы запланавалі. Не пужайцеся гэтага! Падчас інтэрв'ю могуць гучаць розныя пытанні, якія вас зацікавілі. Гэта зробіць інтэрв'ю больш змястоўным і каштоўным.

## ТЫПЫ ІНТЭРВ’Ю

***Наратыўнае інтэрв’ю***

● Вельмі адкрытае ў пачатку
● Інтэрв’юяваны распавядае сваю гісторыю жыцця ці гісторыю, звязаную з падзеяй/перыядам
● Інтэрв’юер пасля задае пытанні для разумення і далей пытанні для раскрыцця дэталей распаведзенай гісторыі

***Экспертнае інтэрв’ю***

● Інтэрв’юяваны разглядаецца як эксперт па спецыфічнай сітуацыі ці тэме
● Інтэрв’юер мае ўжо пэўную ступень ведаў па дадзеным пытанні і задае набор спецыяльных падрыхтаваных пытанняў інтэрв’ю мэтавай групы

***Інтэрв’ю мэтавай групы***

● Выбарка інтэрв’юяваных павінна прадстаўляць сацыяльную групу
● Інтэрв’юер задае набор загадзя вызначаных, аднак адкрытых пытанняў
● Можа праводзіцца ў форме групавой дыскусіі

## АПРАЦОЎКА ІНФАРМАЦЫІ

***Падумайце загадзя:***

● Як апрацоўваць сабраную інфармацыю
● Як параўноўваць і абагульняць дадзеныя з розных інтэрв’ю
● Як структураваць і апрацоўваць і інфармацыю
● Як крытычна тлумачыць інтэрв’ю

Адрознівайце апісанне, тлумачэнне і інтэрпрэтацыю ў дыскурсе інтэрв’ю.

Звярніце ўвагу на тое, якім чынам гісторыя распавядаецца (парадак, узровень дэталізавання, рыторыка, ракурс, ...).

Выдзеліце ўрыўкі (рознымі колерамі), якія вам падаюцца цікавымі.

Падумайце пра лексіку, структуру апавядання і г.д.

## ЯК І ХТО БУДЗЕ АЦЭНЬВАЦЬ РАБОТУ?

Работу будуць ацэньваць прафесійныя гісторыкі, фатографы, журналісты, а таксама арганізатары конкурсу, якія ўвойдуць у склад спецыяльна створанага журы.

***Найлепшымі будуць лічыцца працы, якія:***

● утрымліваюць цікавы і арыгінальны матэрыял;
● дэманструюць уменне на падставе сабранага матэрыялу правесці аналіз і зрабіць высновы адносна ўзаемасувязяў асобы, сям'і і грамадства;
● з'яўляюцца самастойнымі;
● творча і абгрунтавана прадстаўляюць матэрыял;
● маюць лагічную структуру; якасна аформленыя.



## ДАДАТАК № 1

***Заяўка ўдзельніка***
Конкурс "Па-за кадрам:
ад гісторыі сям'і да гісторыі супольнасці"

Назва даследчай работы

___

Аўтар(ы) — інфармацыя пра кожнага

___
прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара працы

___
паштовы адрас (з індэксам)

___
тэлефон (з указаннем кода) электронная пошта

___
месца навучання (працы) поўная назва ўстановы, клас \ група,

___
поўны адрас (з індэксам)

Кіраўнік работы (калі ён ёсць)

___
прозвішча, імя, імя па бацьку

___
тэлефон (з указаннем кода) электронная пошта

___
месца працы (навучання), пасада

Дата
Месца



## ДАДАТАК № 2

***Анкета рэспандэнта***

___
прозвішча, імя, імя па бацьку

___
дзявочае прозвішча

___
дата нараджэння

___
узрост на момант правядзення інтэрв'ю нацыянальнасць

___
месца нараджэння

___
цяперашняе месца пражывання

___
з якога часу жыве ў Беларусі (з нараджэння, з даваеннага, з вайны, з пасляваеннага, інш.)

___
жыхар гарадской ці сельскай мясцовасці

___
месца(ы) пражывання (у выпадку пераезду ўказаць год падзеі, месца і коратка прычыны)

___
бацькі рэспандэнта (сяляне, рабочыя, служачыя, інш.)

___
наяўнасць у рэспандэнта фотаапарата

___
дзе (у студыі, дома) рабіліся сямейныя фота

___
веравызнанне (праваслаўнае, каталіцкае, інш.)

___
адукацыя

___
ці наведваў(ла) гурткі фотааматараў

___
месца(ы) працы

___
мова, на якой размаўляе пастаянна (беларуская, руская ці інш.)

___
іншыя ўдзельнікі інтэрв'ю (прозвішчы, адносіны да рэспандэнта)

___
месца дата

рэспандэнт ___
(подпіс, калі маецца згода на выкарыстанне запісаных матэрыялаў у межах конкурсу, на партале архіва вуснай гісторыі)

1990 1991

## ДЛЯ ЗАПІСАЎ

Гісторыя - гэта не толькі школьны прадмет. Яна паўсюль. Свет, у якім мы жывём, краіны, супольнасці, сем'і і нават нашы ўласныя жыцці аказваюцца пад уплывам гісторыі.

Прымаючы ўдзел у конкурсе, вы не толькі пашыраеце свае веды па гісторыі, але таксама атрымліваеце больш глыбокае разуменне аспектаў развіцця гісторыі найноўшага часу і авалодваеце карыснымі навыкамі (такія як самаарганізацыя, пошук, структураванне, ацэнка і прэзентацыя інфармацыі).

Фотаздымкі Беларусі другой паловы XX стагоддзя, змешчаныя ў брашуры, прадстаўлены Беларускім архівам вуснай гісторыі.

Пры падрыхтоўцы тэксту былі выкарыстаны матэрыялы Ірыны Кашталян, Андрэя Мастыкі, Імке Хансэн, Фонда ім. Кёрбера, міжнароднай сеткі EUSTORY, сайта *urokiistorii.ru.*

Укладальнік - Канстанцін Антановіч
Рэдактар - Марына Маліміна
Дызайн - Марына Шумская

У выпадку неабходнасці дадатковую інфармацыю пра конкурс можна атрымаць:

**сайт:** http://www.dvv-international.org.ua/uz/belarus/

**email:** pazakadram@gmail.com

**тэл.:** +375 (17) 207 98 35,
+375 (29) 171 93 97 (Марына Малініна)
+375 (29) 852 13 18 (Канстанцін Антановіч)

Фонд ім. Кёрбера, міжнародная сетка EUSTORY
Маладзёжнае грамадскае аб'яднанне "Гісторыка"
Прадстаўніцтва зарэгістраванага аб'яднання
"Deutscher Volkshochshul-Verband e.V"
(ФРГ) у Рэспубліцы Беларусь

Пры падтрымцы:

Auswärtiges Amt

Міністэрства замежных
спраў Германіі